Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
___________________Ю.П. Бондар
«____» _________________ 2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ____/вуч.

# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Праграма ўступнага іспыту*
*па спецыяльнасці другой ступені вышэйшай адукацыі*
*1-08 80 07 Тэорыя, методыка і арганізацыя*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

**Складальнікі:**

*Л. І. Казлоўская,* загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*І. А. Малахава,* загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, дацэнт;

*М. М. Каралёў,* дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. У. Самерсава,* прафесар кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*В. М. Кліпініна*, загадчык кафедры сацыяльнай педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. І. Сцепанцоў*, загадчык кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 31.08.2011 г.)

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 11.10.2011 г. )

Адказны за рэдакцыю *В. В. Каташвілі*
Адказны за выпуск *Л. І. Казлоўская*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Значныя сацыяльна-эканамічныя змены ў беларускім грамадстве актуалізуюць патрэбу ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў сацыякультурнай сферы, здольных ажыццяўляць развіццё духоўна-творчага патэнцыялу асобы. Магістратура па спецыяльнасці «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» накіравана на паглыбленне гуманітарнай адукацыі, засваенне інавацыйных педагагічных тэхналогій, а таксама на ўдасканаленне прафесійных кампетэнцый выпускніка другой ступені вышэйшай адукацыі.

Сацыяльна-культурная дзейнасць як галіна навукі аб'ядноўвае шэраг навуковых дысцыплін, генетычна звязаных з ёю па прыкметах адзінства гісторыі, прадметнага поля навукі, метадалагічнага аб'яднання навукоўцаў, інстытуцыянальнай арганізацыі. Праблемнае поле сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі ўключае распрацоўку пытанняў сацыякультурнага менеджменту, арганізацыі і зместу культурна-адпачынкавай дзейнасці, народнай мастацкай творчасці, сацыякультурнага праектавання, культурна-выхаваўчай работы з дзецьмі і моладдзю, сацыякультурнай рэабілітацыі.

Паступаючыя ў магістратуру павінны прадэманстраваць досыць дакладныя веды аб:

– тэарэтыка-метадалагічных асновах сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– дасягненнях сусветнай і айчыннай навуковых школ сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– асноўных кірунках развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці як спецыялізаванай галіны педагогікі;

– асноўных формах работы культурна-адпачынкавых, адукацыйных, турыстычна-спартыўных, аздараўленчых і іншых устаноў, накіраванай на духоўнае развіццё асобы, арганізацыю актыўнага адпачынку розных узроставых катэгорый грамадзян;

– спецыяльных метадах і прыёмах аптымізацыі зместу працы сацыяльна-культурных устаноў з грамадзянамі розных узростаў;

– сучасных тэхналогіях сацыякультурнай анімацыі, што забяспечваюць рэкрэацыю асобы і аптымізацыю яе міжасобаснага ўзаемадзеяння;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– традыцыйнай народнай культуры і спосабах яе захавання і трансляцыі;

– сучасным сацыякультурным менеджменце, маркетынгу.

Паступаючыя ў магістратуру павінны валодаць неабходнымі для спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці арганізацыйнымі, педагагічнымі і творчымі ўменнямі і навыкамі, а таксама мець высокі ўзровень агульнай культуры і эрудыцыі.

Уступны іспыт па спецыяльнасці другой ступені вышэйшай адукацыі «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» ставіць сваёй мэтай выявіць веды абітурыентаў пра сучасную сацыяльна-культурную сітуацыю, уменні і навыкі карыстацца метадамі, сродкамі і тэхналогіямі арганізацыі і навуковага аналізу сацыякультурных з'яў, а таксама здольнасці да выканання самастойнага дысертацыйнага даследавання па дадзенай спецыяльнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ УСТУПНАГА ІСПЫТУ

## Раздзел 1. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці

### *Тэма 1. Праблемнае поле сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі*

Сацыяльна-культурная дзейнасць як галіна педагагічнай навукі. Сутнасць сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі аб засваенні, зберажэнні, стварэнні і трансляцыі культурных каштоўнасцей, ідэалаў, абрадаў, звычаяў, якія характэрны для пэўнай сацыяльнай супольнасці і накіраваны на выхаванне, адукацыю і развіццё творчага патэнцыялу асобы.

Аб'ект сацыяльна-культурнай дзейнасці як галіна рэчаіснасці, якую даследуе дадзеная навука. Мэтанакіраваны працэс выхавання і навучання чалавека ў інтарэсах яго самога і грамадства ва ўмовах спецыяльна арганізаванай сацыякультурнай прасторы як аб'ект сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Прадмет сацыяльна-культурнай дзейнасці як спосаб успрымання аб'екта з пункту гледжання дадзенай навукі. Заканамернасці, прынцыпы, метады і тэхналогіі выхавання і навучання дзяцей і дарослых ва ўмовах спецыяльна арганізаванага сацыяльна-культурнага працэсу як прадмет сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Мэта, задачы і функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі. Сувязь сацыяльна-культурнай дзейнасці з іншымі навукамі (сацыяльнымі, біялагічнымі, псіхалагічнымі).

### *Тэма 2. Метадалогія сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сутнасць метадалогіі як сістэмы прынцыпаў і спосабаў арганізацыі і пабудовы тэарэтычнай і практычнай дзейнасці. Метадалогія сацыяльна-культурнай дзейнасці як вучэнне аб прынцыпах, метадах, формах і працэсах пазнання і пераўтварэння сацыякультурнай рэчаіснасці.

Структура метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі: філасофскі ўзровень метадалогіі, агульнанавуковы ўзровень метадалогіі, канкрэтна-навуковы ўзровень метадалогіі (метадалогія педагогікі як інтэгратыўнай навукі), тэхналагічны ўзровень метадалогіі як набор працэдур, забяспечваючых атрыманне пэўнага эмпірычнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя крыніцы фарміравання тэарэтычных ведаў: вывучэнне гістарычнага і сучаснага айчыннага і замежнага сацыякультурнага вопыту, вынікаў сацыялагічных і педагагічных даследаванняў, вопытна-эксперыментальнай работы, даных сумежных галін ведаў і інш.

*Тэма 3. Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукова-адукацыйны кірунак гуманітарных ведаў*

Сутнасць тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як сістэмы навуковых уяўленняў аб заканамернасцях і змесце педагагічнага працэсу, прынцыпах яго арганізацыі і тэхналогіях ажыццяўлення ва ўмовах вольнага часу.

Асноўныя катэгорыі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць паняцця «сацыяльна-культурная дзейнасць». Суадносіны зместу паняццяў «адукацыя», «выхаванне», «асветніцтва», «сацыяльная педагогіка», «культурна-адпачынкавая дзейнасць», «пазашкольнае выхаванне», «культурна-асветніцкая работа».

Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукова-адукацыйны кірунак гуманітарных ведаў, які сінтэзуе дасягненні культуралогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, педагогікі і іншых навуковых галін. Сацыяльна-культурная дзейнасць як аб'ект даследавання. Структура тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Выкарыстанне сучасных дасягненняў педагагічнай думкі ў тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выхаванне як фактар фарміравання і развіцця асобы.

Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як вучэбная дысцыпліна – абавязковы кампанент адукацыйнага стандарту падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы.

*Тэма 4. Станаўленне і развіццё сацыяльна-культурнай дзейнасці як кірунку навуковых даследаванняў*

Змест сацыяльна-культурнай дзейнасці як мнагасфернай з'явы, якая аб'ядноўвае шматлікія кірункі развіцця культуры, адукацыі, мастацтва, дасугу, народнай творчасці, сацыяльнай рэабілітацыі, турызму. Этапы станаўлення і развіцця тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як аб'екта навуковых даследаванняў.

Навуковыя падыходы да вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Навуковыя школы ў сучаснай тэорыі сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай дзейнасці. Асноўныя кірункі вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці расійскімі даследчыкамі: педагагічны кірунак – прадстаўлены сацыяльна-педагагічнымі канцэпцыямі; дасугавы кірунак – прадстаўлены культурна-дасугавымі канцэпцыямі; арганізацыйна-тэхналагічны кірунак – прадстаўлены культуралагічнымі канцэпцыямі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Асаблівасці развіцця айчыннай навуковай думкі ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці. Кірункі вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці беларускімі даследчыкамі: сацыякультурны, сацыяльна-педагагічны, сацыя-медыка-псіхалагічны.

Праблемы даследавання сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах. Інавацыйны характар і сутнасць навізны сучасных дысертацыйных даследаванняў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 5. Сацыяльна-культурная дзейнасць як від педагагічнай практыкі*

Сацыяльна-культурная дзейнасць як працэс педагагічна арганізаванага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва мноства суб’ектаў – носьбітаў культуры, мастацтва, адукацыі, адпачынку.

Педагагічная сутнасць сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выхаванне як мэтанакіраваны працэс станаўлення асобы пад уздзеяннем разнастайных фактараў. Заканамернасці, прынцыпы, метады і сродкі выхавання ў сучаснай педагагічнай навуцы.

Віды сацыяльна-культурнай дзейнасці адносна розных крытэрыяў: індывідуальная і калектыўная, прафесійная і аматарская, духоўная і матэрыяльна-пераўтваральная, а таксама пазнавальная, каштоўнасна-арыентацыйная, творчая, праектная, камунікатыўная, мастацкая, тэхнічная і інш. – у адпаведнасці з інтарэсамі і запатрабаваннямі асобы.

Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як працэс стварэння ўмоў для матываванага выбару асобай прадметнай дзейнасці ў залежнасці ад яе інтарэсаў з мэтай садзейнічання самарэалізацыі і самаразвіццю асобы, задавальнення эстэтычных, камунікатыўных, рэкрэацыйных, творчых і іншых запатрабаванняў, камфортнага існавання ў соцыуме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Інфраструктура сацыякультурнай сферы*

Сутнасць сацыякультурнай сферы як сістэмы разнастайных сацыякультурных інстытутаў, якія каардынуюць дзейнасць чалавека па засваенні, інтэрыярызацыі, захаванні, трансляцыі, развіццю культурных каштоўнасцей і ўздзейнічаюць на выхаванне і фарміраванне асобы. Два ўзроўні разумення сутнасці сацыякультурных інстытутаў: нарматыўны і статутны.

Паняцце інфраструктуры сацыякультурнай сферы як сукупнасці матэрыяльных, арганізацыйных, фінансава-эканамічных, кадравых, інфармацыйна-метадычных і іншых рэсурсаў, якія неабходны для ажыццяўлення сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Установы сацыякультурнай сферы: мастацтва, культурна-адпачынкавыя, навукова-асветныя, турысцка-экскурсійныя, санаторна-курортныя, спартыўна-аздараўленчыя, відовішчна-камерцыйныя, мастацка-адукацыйныя, культураахоўныя.

*Тэма 7. Псіхолага-педагагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Педагагічная сістэма сацыяльна-культурнай дзейнасці як сукупнасць узаемазвязаных і ўзаемазалежных кампанентаў, якія забяспечваюць педагагічна мэтазгодную арганізацыю сацыяльна-культурнай дзейнасці асобы і сацыяльных груп насельніцтва, а таксама ўсіх суб'ектаў выхавання.

Паняцце аб'екта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сацыяльна-дэмаграфічныя, узроставыя і індывідуальныя параметры ўдзельнікаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Паняцце суб'екта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Чалавек як суб'ект гэтай дзейнасці. Характарыстыка сацыякультурных устаноў як абагульненага суб'екта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Творцы і карыстальнікі культурных каштоўнасцей як суб'екты сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Выкарыстанне сацыялагічных метадаў у дзейнасці сацыякультурных устаноў. Характарыстыка і ўмовы выкарыстання апытальных метадаў: анкетаванне, гутарка, інтэрв'ю, рэйтынг.

Выкарыстанне метадаў педагагічнай навукі ў дзейнасці сацыякультурных устаноў. Характарыстыка і ўмовы выкарыстання тэарэтычных і эмпірычных метадаў педагагічнай навукі. Выкарыстанне матэматычных метадаў: ранжыраванне, шкаліраванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 8. Гістарычныя перадумовы станаўлення і развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Асноўныя гістарычныя этапы станаўлення і развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці. Характарыстыка культурнага асяроддзя на беларускіх землях у эпоху ранняга і сярэдняга Сярэднявечча. Асветніцкая дзейнасць Е.Полацкай, К. Тураўскага.

Развіццё культурных працэсаў на беларускіх землях у часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Храмы і манастыры як цэнтры развіцця беларускай культуры. Творчасць скамарохаў і асноўныя кірункі іх дзейнасці. Саслоўныя формы баўлення вольнага часу ў 14–16 стст. Асветніцкая дзейнасць Ф.Скарыны.

Развіццё культурных працэсаў на беларускіх землях у эпоху Асветы. Сацыякультурнае жыццё беларускіх гарадоў. Тэатральная творчасць на беларускіх землях у гэтую эпоху.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці на беларускіх землях у перыяд уваходжання іх у склад Расійскай імперыі (18 – пачатак 20 ст.). Дзейнасць дабрачынных і добраахвотных таварыстваў. Аматарскія аб’яднанні другой паловы 19 ст. Дзейнасць народных дамоў, народных універсітэтаў, публічных бібліятэк і інш.

Кірункі развіцця культурна-асветніцкай дзейнасці ў БССР. Сацыяльная роля ўстаноў культуры ў развіцці культурнай сферы вольнага часу, святочнай дзейнасці, арганізацыі адпачынку і аматарскай мастацкай творчасці.

Сацыяльна-культурная дзейнасць у Беларусі ва ўмовах грамадска-палітычных пераўтварэнняў у канцы 20 – пачатку 21 ст. Педагагічны статус сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасным грамадстве.

*Тэма 9. Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Прынцып як асноваўтваральная, фундаментальная ідэя ці палажэнне. Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці як катэгорыі, накіраваныя на раскрыццё сутнасці развіцця сацыякультурных працэсаў.

Пабудова сучаснай парадыгмы сацыяльна-культурнай дзейнасці на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых інтарэсаў; усеагульнай масавай культуратворчасці; самаарганізацыі і самасцвярджэння асобы; гуманізацыі зместу і выхаваўчага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патэнцыялу гэтай дзейнасці; падпарадкавання гэтай дзейнасці інтарэсам, патрэбнасцям і ўстаноўкам асобы; дыялектычнага адзінства і пераемнасці культурна-гістарычнага, сацыяльна-педагагічнага і нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і інавацый; грамадска-дзяржаўнага сукіравання гэтай дзейнасцю; забеспячэння дэцэнтралізацыі і суверэннасці рэгіянальнай палітыкі ў сацыякультурнай сферы, ініцыятывы і самадзейнасці яе суб'ектаў; пераемнасці і паслядоўнасці далучэння чалавека да з'яў культуры і інш.

Характарыстыка змен у ідэалогіі культурнай дзейнасці, абумоўленасць звароту сацыяльна-культурных устаноў да запытаў канкрэтнай асобы, гуманізацыі вытворчых адносін, праяўлення цярпімасці, павагі да меркавання меншасці, умення чуць іншых і быць пачутым імі.

Сацыякультурныя інстытуты як носьбіты і праваднікі гуманістычных ідэй, заснавальнікі нацыянальнай культуры, народных традыцый, агульначалавечых каштоўнасцей.

*Тэма 10. Функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Функцыя як адлюстраванне пэўных кірункаў і бакоў дзейнасці асобных людзей, супольнасці, сацыяльна-культурных інстытутаў, грамадскіх фарміраванняў і рухаў. Абумоўленасць функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці новай сацыякультурнай сітуацыяй і сучаснымі патрабаванні да сацыяльных інстытутаў.

Характарыстыка асноўных функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці як формы сацыяльнай практыкі, якія забяспечваюць рэалізацыю выхаваўчых мэт і задач, механізмаў асваення і стварэння культурных каштоўнасцей: адаптацыйная; развіваючая; адукацыйная; культурааарыентуючая; культураствaральная; культураахоўная; рэкрэацыйна-аздараўленчая; камунікатыўная.

Арыентаванасць сацыяльна-культурнай дзейнасці як працэсу актыўнага асваення, распаўсюджвання і стварэння культурных каштоўнасцей на фарміраванне культурнага асяроддзя жыццядзейнасці чалавека, распрацоўку механізма яго сацыялізацыі, інкультурацыі і самарэалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 2. Арганізацыйна-метадычныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці

### *Тэма 1. Формы, метады і сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Форма сацыяльна-культурнай дзейнасці як сукупнасць пэўных сродкаў і метадаў арганізацыі дзейнасці асобы і сацыяльных груп насельніцтва ва ўмовах вольнага часу. Характарыстыка форм з улікам ахопу насельніцтва: масавыя, групавыя, індывідуальныя; паводле спосабаў уздзеяння: тэатралізаваныя, гульнёвыя, ілюстраваныя; у залежнасці ад зместу і відаў дзейнасці: рэкрэацыйныя, інфармацыйныя, самадзейнай творчасці, рэабілітацыйныя, спартыўна-аздараўленчыя і інш.

Метады сацыяльна-культурнай дзейнасці як спосабы яе арганізацыі ў розных сацыякультурных установах. Педагогіка супрацоўніцтва як метадалагічная аснова арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Класіфікацыі метадаў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці па розных крытэрыях. Характарыстыка метадаў фарміравання грамадскай свядомасці. Метады стымулявання сацыяльна-культурнай актыўнасці асобы. Метады арганізацыі творчай дзейнасці асобы і калектыву.

Сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці як крыніцы яе ажыццяўлення. Класіфікацыя сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Характарыстыка сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці: тэхнічных, розных відаў мастацтва і літаратуры, сродкаў масавай інфармацыі, аматарскай творчасці і інш.

### *Тэма 2. Культурна-адпачынкавая дзейнасць*

Культурна-адпачынкавыя канцэпцыі ў сучаснай сацыяльна-культурнай тэорыі і практыцы. Рэалізацыя культурна-адпачынкавай дзейнасці як узаемадзеянне сацыялізацыі і інкультурацыі асобы. Вядучыя прынцыпы культурна-адпачынкавай дзейнасці: непарыўная сувязь з жыццём і практычнымі задачамі; дыферэнцыраваны падыход да розных сацыяльных груп; апора на самадзейнасць людзей; індывідуалізацыя; паслядоўнасць; сістэмны падыход да вырашэння культурна-адпачынкавых задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

*Гульнёвыя тэхналогіі.* Паняцці «гульня» «гульнёвая дзейнасць». Сутнасць і прырода гульні. Феномен гульні ў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Функцыі гульні: выхаваўчая, сацыялізацыі, камунікатыўная, геданістычная, кампенсаторная, сімвалічная і інш. Развіццё гульнёвага жанру ў Беларусі.

*Інфармацыйна-адукацыйныя тэхналогіі.* Змест і сутнасць інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці ў соцыуме. Інфармацыйна-адукацыйная дзейнасць як сацыяльна-педагагічны працэс. Формы інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці.

*Святочна-абрадавыя тэхналогіі.* Сувязь святочных традыцый з прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі, сацыяльнай структурай грамадства, узроўнем развіцця вытворчых сіл. Сучасная святочная культура беларусаў. Абрады і святы і іх роля ў жыцці грамадства. Асноўныя формы святочнай дзейнасці ў Беларусі. Класіфікацыя свят, абрадаў і відовішчаў.

*Рэкрэацыйна-анімацыйныя тэхналогіі.* Сацыяльна-псіхалагічная і педагагічная сутнасць рэкрэацыйна-анімацыйнай дзейнасці. Функцыі і асноўныя формы рэкрэацыйна-анімацыйнай дзейнасці.

*Рэабілітацыйныя тэхналогіі.* Сфера вольнага часу як умова рэалізацыі сацыяльна-ахоўнай, прафілактыка-карэкцыйнай і адаптацыйнай дзейнасці. Структура ведаў, уменняў і навыкаў у галіне сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Прынцыпы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі асобы.

*Сацыякультурнае праектаванне* як метад навуковага пазнання і прыкладная дысцыпліна. Сутнасць, змест, прынцыпы і функцыі сацыякультурнага праектавання. Асноўныя структурныя кампаненты сацыякультурнага праектавання.

*Тэма 4. Аматарская творчасць*
*як сацыяльна-педагагічная з'ява*

Аматарская творчасць як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу. Гістарычная дынаміка развіцця аматарскай творчасці ў Беларусі. Віды і формы аматарскай творчасці. Арганізацыйна-педагагічная дзейнасць у сферы аматарскай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аматарская мастацкая творчасць як своеасаблівы пласт народнай творчасці, адна з форм праяўлення сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў сферы вольнага часу.

Віды і формы аматарскай мастацкай творчасці. Аўтарская і выканальніцкая аматарская творчасць. Аматарскія мастацкія калектывы як грамадска-культурныя аб'яднанні аматараў музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва. Клубы па інтарэсах і аматарскія аб'яднанні ў структуры вольнага часу насельніцтва.

*Тэма 5. Традыцыйная народная культура ў сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Выкарыстанне традыцый народнай культуры як неад'емнай часткі жыцця грамадства. Дэтэрмінаванасць выкарыстання традыцый народнай культуры этнакультурнымі, гістарычнымі, рэлігійнымі, грамадскімі традыцыямі, а таксама сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і іншымі фактарамі.

Традыцыі і навацыі ў сучасных каляндарных святах. Унёсак беларускіх даследчыкаў у распрацоўку тэарэтычных і тэхналагічных пытанняў выкарыстання традыцый народнай культуры ў сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці.

## Раздзел 3. Менеджмент сацыяльна-культурнай дзейнасці

*Тэма 1. Паняцце і функцыі менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Паняцце і прыметы функцый. Функцыі: *планавання* (вызначэнне будучыні тэндэнцый і перспектыў развіцця аб'екта кіравання); *арганізацыі* (стварэнне, развіццё і захаванне структуры прадпрыемства; дэлегіраванне паўнамоцтваў; рэгламентацыя); *матывацыі* (заахвочванне работніка да працоўнай дзейнасці, змястоўныя і працэсуальныя тэорыі); *кантролю* (забеспячэнне мэт арганізацыі; вызначэнне якасці і карэкціроўка выконваемых работ); *каардынацыі* (забеспячэнне адзінства і ўзгодненасці ўсіх стадый працэсу кіравання на ўсіх узроўнях іерархічнай структуры арганізацыі). Спецыфічныя функцыі кіравання (падзел на пэўныя бакі і сферы дзейнасці прадпрыемства), у якіх аднаўляюцца кіраўніцкія цыклы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Сістэма дзяржаўнага кіравання сферай сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Станаўленне і развіццё інстытутаў кіравання культурай у Рэспубліцы Беларусь. Ажыццяўленне дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры. Структура кіраўнічых органаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

Галоўныя функцыі Міністэрства культуры па захаванні, развіцці і распаўсюджванні культуры. Мясцовыя органы кіравання культурай у адпаведнасці з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам краіны.

Дзейнасць спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Асаблівасці кіравання арганізацыямі культуры. Інавацыйныя (праектаванне) і традыцыйныя (адміністрыраванне) падыходы ў развіцці сістэмы кіравання сферай культуры. «Тэхналагічны» (алгарытмічны) і «асобасны» (інтуітыўны) падыходы ў арганізацыі дзейнасці ўстаноў культуры.

*Тэма 3. Асноўныя напрамкі рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у сацыякультурнай сферы*

Развіццё нацыянальнай культуры як важны кірунак Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 году (раздзел «Развіццё нацыянальнай культуры»). Азначэнне паняцця «культурная палітыка». Мноства суб’ектаў культурнай палітыкі. Арыенціры сучаснай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Структура кіруючых органаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Кірункі дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры ў адпаведнасці з арт. 12 Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь». Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры, вызначаныя гэтым Законам (арт. 21). Галоўныя функцыі Міністэрства культуры. Мясцовыя органы кіравання культурай. Дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

*Тэма 4. Паняцце эфектыўнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сутнасць эфектыўнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сацыяльная эфектыўнасць як найважнейшая характарыстыка вынікаў культурнай дзейнасці; суаднесенасць з эканамічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфектыўнасцю. Віды эфектыўнасці: мэтавая, затратная, патрэбнасная.

Асноўныя методыкі ацэнкі паказчыкаў эфектыўнасці арганізацый культуры. Характарыстыкі непасрэдных вынікаў працы ў сувязі з узроўнем арганізацыі вытворчасці і станам сацыяльна-псіхалагічнай атмасферы ў арганізацыі культуры. Падзел эфектыўнасці кіраўніцкага рашэння на арганізацыйную, эканамічную, этычную і палітычную.

### *Тэма 5. Метадычнае забеспячэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Агульнае паняцце аб інфармацыйна-метадычным забеспячэнні сацыяльна-культурнай дзейнасці, яго сутнасць і асноўныя задачы. Месца і роля інфармацыйна-метадычнага забеспячэння ў сістэме кіравання СКД. Функцыі інфармацыйна-метадычнага забеспячэння СКД (агульныя, спецыфічныя). Тэхніка метадычнай працы. Дзейнасць навукова-метадычных структур розных узроўняў.

### *Тэма 6. Кампетэнтнасная мадэль спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сацыяльна-культурная дзейнасць як прастора прафесійнай дзейнасці выпускніка вышэйшай навучальнай установы культуры і мастацтва. Спецыфіка сацыяльна-культурнай дзейнасці як сферы прафесійных кампетэнцый асобы. Характарыстыка відаў сацыяльна-культурнай дзейнасці як сферы пряменення прафесійных кампетэнцый выпускніка ВНУ.

Прафесіяналізм спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці як аснова і сутнасць яго майстэрства. Структура і кампаненты прафесійнага майстэрства спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці: гуманістычная накіраванасць асобы спецыяліста; прафесійныя веды, уменні і навыкі; прафесійныя здольнасці, прафесійная педагагічная тэхніка спецыяліста.

Кампетэнтнасная мадэль спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці як комплекс акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый выпускніка вышэйшай навучальнай установы сферы культуры і мастацтва. Характарыстыка прафесійных кампетэнцый спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці з вышэйшай адукацыяй (па асноўных відах дзейнасці).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Аб культуры* ў Рэспубліцы Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 4 чэрв. 1991 г., № 832-XII. – URL : http : www. nlb.by.

*Ариарский, М.А.* Социально-культурная деятельность как предмет научного осмысления / М. А. Ариарский. – СПб. : Концерт, 2008. – 792 с.

*Бабосов, Е. М.* Социология управления : учеб. пособие / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2002. – 288 с.

*Бакланова, Т. И.* Организация и научно-методическое обеспечение художественной самодеятельности : учеб. пособие / Т. И. Бакланова. – М. : МГИК, 1992. – 102 с.

*Воловик, А. Ф.* Педагогика досуга : учебник / А. Ф. Воловик, В. А. Воловик. – М. : Флинта, 1998. – 240 с.

*Грыгаровіч, Я.Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапаможнік / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – С. 9–11, 183–212.

*Дуликов, В.З.* Социально-культурная работа за рубежом : тенденции развития : учеб. пособие / В. З. Дуликов. – М. : МГУКИ, 2003. – 115 с.

*Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности : учеб. пособие для студ. вузов культуры и искусств / А. Д. Жарков. – 2-е изд. – М. : Профиздат, 2002. – 288 с.

*Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

*Козловская, Л.И.* Особенности игры в социокультурной деятельности / Л. И. Козловская // Весн. БДУКМ. – 2011. – № 1(15). – С. 119– 126.

*Козловская, Л. И.* Досуговая программа в системе социокультурной деятельности / Л. И. Козловская // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2002. – № 3. – С. 15–18.

*Культурно*-досуговая деятельность : учебник / под науч. ред. А. Д. Жаркова, В. М. Чижикова. – М. : МГУК, 1998. – 461 с.

*Ліцвінка, В.* Святы і абрады беларусаў / В. Ліцвінка. – Мінск : Беларусь, 1998. – 189 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Малахова, И. А.* Развитие личности : учеб. пособие : в 2 ч. / И. А. Малахова. – Минск : Беларус. навука, 2002. – Ч. 1. Способность к творчеству, одаренность, талант. – 158 с.

*Малахова, И. А.* Развитие личности : учеб. пособие : в 2 ч. / И. А. Малахова. – Минск : Беларус. навука, 2003. – Ч. 2. Художественно-творческая деятельность. – 147 с.

*Малахова, И. А.* Развитие креативности личности в социокультурной сфере: педагогический аспект : [монография] / И. А. Малахова. – Минск : БГУКИ, 2006. – 345 с.

*Мосалев, Б. Г.* Досуг : методология и методика социологических исследований : учеб. пособие / Б. Г. Мосалев. – М. : МГУК, 1995. – 96 с.

*Самерсова, Н. В.* Экологическая культура личности: социокультурный аспект / Н. В. Самерсова. – Минск : БГУКИ, 2011. – 284 с.

*Социокультурная* деятельность как средство воспитания личности : учеб. пособие / под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Выш. шк., 2004. – 165 с.

*Стрельцов, Ю.А.* Культурология досуга : учеб. пособие / Ю. А. Стрельцов. – 2-е изд. – М. : МГУКИ, 2003. – 296 с.

*Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент в сфере культуры : учеб. пособие / Г. Л. Тульчинский, Е. Л. Шекова. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2009. – 544 с.

*Ярошенко, Н. Н.* История и методология теории социально-культурной деятельности : учебник / Н. Н. Ярошенко. – М. : МГУКИ, 2007. – 360 с.

*Дадатковая*

*Атлас* социально-культурных реабилитационных технологий / сост. Ю. С. Моздокова. – М. : МГУКИ, 2002. – 132 с.

*Бакланова, Н. К.* Профессиональное мастерство работника культуры : учеб. пособие / Н. К. Бакланова. – М. : МГИК, 1996. – 120 с.

*Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята / П. А. Гуд. – Мінск : БДУКМ, 2008. – 234 с.

*Дуликов, В. З.* Социальные аспекты культурно-досуговой деятельности за рубежом : учеб. пособие / В.З. Дуликов. – М. : МГУКИ, 1999. – 109 с.

*Каралёў, М. М.* Асноўныя кірункі падрыхтоўкі менеджараў сацыяльна-культурнай сферы / М. М. Каралёў // Весн. БДУК, 2002. – №1. – С. 61–65.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Наумчик, В. Н.* Педагогическая культура в социокультурной деятельности / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников. – Вильнюс : Ксения, 2003. – 91 с.

*Попов, В. В.* Культурно-досуговая деятельность в контексте научного исследования / В. В. Попов, Ф. Х. Попова. – Тюмень : Тюмен. гос. ун-т, 2004. – 176 с.

*Садовская, В. С.* Лабиринты культуры быта : исследование реальности: [монография] / В. С. Садовская. – М. : МГУКИ, 2003. – 252 с.

*Соколов, А. В.* Феномен социально-культурной деятельности / А. В. Соколов. – СПб. : СПбГУП, 2003. – 204 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

*Праграма ўступнага іспыту*
*па спецыяльнасці другой ступені вышэйшай адукацыі*
*1-08 80 07 Тэорыя, методыка і арганізацыя*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Рэдактар В. В. Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84 1/16.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,11. Ул.-выд. арк. 0,76. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ